# ЛЁГКАГА ЎЗЛЁТУ, МЯККАЙ ПАСАДКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тым не менш было зразумела, што без другой паласы не абысціся, бо аэрапорт, паводле слоў беларускага лідара, гэта візітоўка краіны. Ён запрасіў да сябе тады яшчэ міністра транспарту і камунікацый Анатоля Сівака і паведаміў, што яе будуць будаваць беларускія спецыялісты. Нагадаем, што яны здолелі пабудаваць шматкіламетровую МКАД-2 па падобнай з узлётна-пасадачнай паласой тэхналогіі.

«Сёння мы маем паласу. Не сакрэт, што я з гэтай паласы ўжо ўзлятаў і ноччу прызямляўся (падчас вылету і прылёту ў Кітай. — **«Звязда»**)», — адзначыў беларускі лідар. Тады кіраўнік дзяржавы спытаў у свайго пілота, як ён ацэньвае навінку. Той адказаў, што такія якасныя палосы ён бачыў толькі ў Арабскіх Эміратах. Такім чынам, беларусы змаглі зрабіць гэта сваімі сіламі — і кошт праекта ў разы адрозніваецца ад першапачатковай прапановы замежнай кампаніі.

«Гэта вельмі вялікае наша дасягненне, якое сведчыць пра тое, што мы можам усё. Толькі трэба настроіцца на тое, каб гэта зрабіць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Акрамя таго, беларускі лідар расказаў, што шмат гадоў таму, на пачатку яго прэзідэнцтва, яму прапанавалі прыватызаваць усе беларускія аэрапорты — асабліва настойвалі на Нацыянальным аэрапорце Мінск. Цікава, што гэта былі замежныя інвестары.

«Гасподзь падштурхнуў мяне прыняць правільнае рашэнне. Я адмовіўся ад прыватызацыі ўсіх аэрапортаў у краіне, у тым ліку і гэтага», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт упэўнены — галоўныя паветраныя вароты краіны, таксама як і ўсе астатнія, павінны быць дзяржаўнымі.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў усім, хто прымаў удзел у будаўніцтве новай узлётна-пасадачнай паласы. «Я вам удзячны за тое, што вы зрабілі», — адзначыў Прэзідэнт і дадаў, што цяпер будаўнікам трэба рыхтавацца да яшчэ больш няпростых падзвігаў.

На яго думку, беларусы ў сваёй хаце ўсё павінны рабіць сваімі рукамі — яны гэта ўмеюць.

Таксама кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што мадэрнізацыя аэрапорта працягнецца, а таксама адзначыў, што нашаму нацыянальнаму аэрапорту патрэбна адметнасць, як у іншых дзяржавах.

У гонар адкрыцця другой узлётна-пасадачнай паласы ад работнікаў аэрапорта беларускаму лідару падарылі макет самалёта Boeing 767 300ER — борта нумар адзін.

Пасля беларускі лідар пагутарыў з работнікамі аэрапорта і будаўнікамі.

### А ШТО БУДЗЕ СА СТАРОЙ ПАЛАСОЙ?

Падчас наведвання аэрапорта Прэзідэнту далажылі, што першую ўзлётна-пасадачную паласу пачнуць рамантаваць у 2020 годзе. Рэканструкцыя ацэньваецца ў 90 млн долараў. Па плане яна зойме два-тры гады. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы агучыў два жалезныя патрабаванні: аднавіць паласу без усялякіх празмернасцяў і ў выключна сціслыя тэрміны.

Яшчэ адно даручэнне беларускага лідара — арганізаваць зручныя чыгуначныя зносіны паміж Мінскам, індустрыяльным паркам «Вялікі камень» і аэрапортам.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

### Каментарый у тэму

**Генеральны дырэктар Нацыянальнага аэрапорта Мінск Дзмітрый МЕЛІКЯН:**

— Які эфект дасць аэрапорту другая ўзлётна-пасадачная паласа? Эфект вельмі простым: маючы старую паласу, мы не маглі выкарыстоўваць яе на 100 %, паколькі яна ўжо, калі груба казаць, пазношвалася. Другая ўзлётна-пасадачная паласа дае нам магчымасць прыёму паветраных суднаў усіх тыпаў, а таксама магчымасць бязмежнага развіцця аэрапорта.

Другая паласа дала нам другое дыханне і надзею на тое, што ў нас колькасць работы будзе павялічвацца дакладна гэтак жа, як і паток пасажыраў. Новая паласа не будзе прастойваць — больш за тое, маючы дзве паласы, ёсць магчымасць кароткачасова спыняць работу на першай паласе і рабіць рамонт.

Што датычыцца далейшай мадэрнізацыі аэрапорта — гэта рэканструкцыя першай паласы ў абавязковым парадку, працяг мадэрнізацыі існуючага тэрмінала (калі яна будзе завершана, да 9-10 млн пасажыраў у год можам тут абслугоўваць), праектаванне другога тэрмінала.

Заканчэнне мадэрнізацыі першага тэрмінала плануецца да 30 мая — да II Еўрапейскіх гульняў.

## Прэзідэнт падпісаў указ...

* * *

Ветэранам Вялікай Айчыннай вайны дадзена права бясплатнага праезду ў цягніках міжнародных зносін паміж Беларуссю і Расіяй, а таксама ў цягніках унутрырэспубліканскіх зносін. Адпаведны ўказ Прэзідэнт падпісаў 2 мая, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Згаданай магчымасцю ветэраны змогуць скарыстацца ў перыяд правядзення мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 75-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

* * *

Прэзідэнт падпісаў Указ № 164, якім комплексна ўрэгуляваны пытанні правядзення ў Мінску II Еўрапейскіх гульняў.

Дакумент уносіць змены ў асобныя ўказы, якія датычацца арганізацыі спаборніцтваў. У прыватнасці, рэгулююцца пытанні выкарыстання дзяржаўнай маёмасці, эксплуатацыі радыёэлектронных сродкаў і высокачастотных прылад, медыцынскага абслугоўвання ўдзельнікаў і гасцей II Еўрапейскіх гульняў і іншыя практычныя пытанні іх падрыхтоўкі і правядзення. Прадугледжаны меры, якія дазваляюць знізіць кошт арганізацыі гэтай маштабнай падзеі.

У дадатак да бясплатнага праезду ў мінскім гарадскім пасажырскім транспарце ўдзельнікам і валанцёрам Гульняў дадзена права бясплатнага праезду ў прыгарадным пасажырскім транспарце па маршрутах, якія звязваюць сталіцу з Нацыянальным аэрапортам Мінск і Заслаўем. Акрэдытаваныя на Гульнях замежнікі вызвалены ад неабходнасці рэгістрацыі на тэрыторыі Беларусі.

* * *

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 166 «Аб арганізацыі ўступнай кампаніі ва ўстановах адукацыі ў 2019 годзе».

Дакументам створана дзяржаўная камісія па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 2019 годзе, а таксама вызначаны яе паўнамоцтвы.

У склад камісіі ўключаны члены ўрада, Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і работнікі кантрольных органаў. Старшынёй камісіі прызначаны намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка.

Камісія заклікана забяспечыць кантроль за падрыхтоўкай і правядзеннем цэнтралізаванага тэсціравання, іншых формаў уступных іспытаў, стварэннем абітурыентам роўных магчымасцяў пры паступленні ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Сярод яе абавязкаў — прыняцце мер па ліквідацыі парушэнняў заканадаўства, якое рэгулюе арганізацыю і правядзенне прыёму, ажыццяўленне прыёму грамадзян па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў, а таксама забеспячэнне асвятлення работы камісіі ў сродках масавай інфармацыі.

## Парламенцкі дзённік

# БІЗНЕС ПЛЮС КУЛЬТУРА

### Савет Рэспублікі наведалі прадстаўнікі буйных кампаній КНР

**Гадавы абарот кітайскага аператара нерухомасці Shimao Group складае каля 9 мільярдаў долараў, а старшыня савета яе дырэктараў Сю Жунмаа займае 22 месца ў кітайскім спісе Forbes і 160 радок у сусветным рэйтынгу самых багатых людзей па версіі часопіса. Менавіта гэты чалавек, які да таго ж з'яўляецца кіраўніком Канфедэрацыі кітайскіх прадпрымальнікаў-рээмігрантаў, членам пастаяннага камітэта Усекітайскага камітэта Народнага палітычнага кансультатыўнага савета Кітая і дарадцам Усекітайскай федэрацыі эмігрантаў, а таксама дзесяць іншых буйных бізнесменаў КНР сустрэліся са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаілам Мясніковічам у рамках двухдзённага візіту ў Беларусь.**

Старшыня Савета Рэспублікі заўважыў, што нядаўні саміт у Пекіне адкрывае новую старонку як шматбаковага, так і двухбаковага супрацоўніцтва. «Каштоўнасць нашай сустрэчы для мяне заключаецца яшчэ і ў тым, што я разам з калегамі па парламенцкай дзейнасці сустракаюся ўпершыню з такімі кіраўнікамі сучаснага Кітая, — дадаў спікер верхняй палаты беларускага парламента. — Я шмат чуў і чытаў добрага пра Усекітайскі камітэт Народнага палітычнага кансультатыўнага савета Кітая і пра Канфедэрацыю кітайскіх прадпрымальнікаў-рээмігрантаў, але пачуць пра іх з першых вуснаў, канешне, даражэй за ўсё».

Міхаіл Мясніковіч выказаў меркаванне, што ў Беларусі з Кітаем добрая перспектыва супрацоўніцтва і прапанаваў сумесна абмеркаваць яго канкрэтныя механізмы.

У сваю чаргу Старшыня савета дырэктараў Shimao Group спадар Сю Жунмаа паведаміў, што за два дні візіту інтарэс кітайскіх бізнесменаў да Беларусі як партнёрскага рэгіёна ўзмацніўся. «Мы ўбачылі, што ў нашым супрацоўніцтве маецца вельмі вялікая ўзаемадапаўняльнасць. Беларусь вылучае выгаднае геаграфічнае становішча, гэта буйны і важны транспартны вузел у Еўраазіяцкім рэгіёне, мы маглі б выкарыстаць гэтую перавагу, каб здабыць максімальную карысць у гандлёвым, эканамічным і гуманітарным супрацоўніцтве», — сказаў ён.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Блізкая ўлада

# ПАЧУЦЬ КОЖНАГА

**Як у цэнтральным рэгіёне выконваюцца патрабаванні Дырэктывы № 2 «Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату і павышэнні якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва», абмеркавалі на пасяджэнні Мінаблвыканкама.**

— У 2018 годзе Мінаблвыканкам, гар-, райвыканкамы, пасялковыя, сельскія выканкамы разгледзелі 34 тысячы зваротаў грамадзян. У першым квартале гэтага года — каля 8 тысяч. І колькасць іх штогод павялічваецца. Напрыклад, у параўнанні з першым кварталам мінулага года ў адпаведным перыядзе 2019-га іх стала больш на 4 працэнты, — адзначыла **начальнік упраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Аксана ТАРАНДА.** — А гэта сведчыць аб недапрацоўках. На «Вялікую размову» да Прэзідэнта паступіла 194 паведамленні ад жыхароў Мінshчыны, у тым ліку 64 датычыліся будаўніцтва і выдзялення зямельнага ўчастка жыллёва-будаўнічаму вытворчаму кааперыву «Стрыж-11» у пасёлку Лясны Мінскага раёна. Заяўнікі скардзіліся на тое, што неадназначна ўлады мянялі месца для размяшчэння жылога дома, не прымалі меры, каб пачаць яго будаўніцтва. Гэтае пытанне разглядаецца на самым высокім узроўні і ў цяперашні час знаходзіцца ў працэсе вырашэння.

Наогул, тэматыка зваротаў да абласных і раённых улад застаецца нязменнай: дарогі, архітэктура і будаўніцтва, жыллёва-камунальная гаспадарка, добраўпарадкаванне населеных пунктаў, старшыня жылых дамоў.

**Старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** лічыць, што мала праводзіць прыёмы грамадзян, тэлефонныя, гарачыя лініі. «Мы павінны не чакаць, калі людзі прыйдуць да нас, а самі ісці да іх, перш уважліва вывучыўшы праблемы таго ці іншага населенага пункта, і пры сустрэчы прапаноўваць шляхі іх рашэння. Гэта дасць свой вынік».

У прыклад калегам Анатоль Міхайлавіч паставіў старшыню Мінскага райвыканкама Івана Крупко, які сустрэўся з жыхарамі Калодзішчаў, разам яны абмеркавалі набалелае, прыйшлі да кансэнсусу. Такую практыку варта пераняць усім кіраўнікам раёнаў. Пры гэтым не трэба даваць неабгрунтаваных абяцанняў людзям, падкрэсліў губернатар. Але перш за ўсё неабходна вырашаць комплексныя, сістэмныя праблемы. Напрыклад, летась было многа заяў па рамонце дарог. Аказалася, што многія з іх у вобласці нікому не належаць. Была праведзена інвентарызацыя, і рашэннем Мінаблвыканкама яны перададзены на баланс абслуговых арганізацый, у асноўным жыллёва-камунальнай гаспадаркі. У Мінскім раёне створана новая буйная спецыялізаваная арганізацыя «Мінскгарайрамаўтадар», для якой закупілі неабходную тэхніку. З 1 студзеня 2019 года яна ўзяла на абслугоўванне дарогі прысталічнага рэгіёна. І колькасць скаргаў зменшылася.

У 2018 годзе ў Адміністрацыю Прэзідэнта было накіравана амаль 25 тысяч зваротаў, больш за палову з іх пытанні, якія адносяцца да кампетэнцыі мясцовых органаў улады. У тым ліку ад жыхароў Міншчыны атрымана 3752 звароты. Гэта самая вялікая колькасць сярод рэгіёнаў краіны пасля Мінска. У разрэзе раёнаў Міншчыны ў «лідарах» — Мінскі — 1048 зваротаў, Маладзечанскі — 350, Салігорскі — больш за 300. Кожны трэці зварот ад жыхароў цэнтральнага рэгіёна ў Адміністрацыю Прэзідэнта паўторны. Усяго ж такіх 1275.

— Гэта ў пэўнай ступені сведчыць аб тым, што на месцах звароты ўсё яшчэ разглядаюць фармальна, не высвятляюць іх сутнасць, — лічыць **начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Рыгор ШЛЫК.**

Асаблівую ўвагу прысутных ён звярнуў на работу з калектыўнымі зваротамі. Адміністрацыя Прэзідэнта за мінулы год атрымала іх 251. Больш за ўсё са сталіцы, на другой пазіцыі Мінская вобласць.

— Адміністрацыі Прэзідэнта ў гэтым выпадку даводзіцца ўмешвацца і браць сітуацыю пад кантроль. На працягу 2017—2018 гадоў некалькі разоў звярталіся па пытаннях уладкавання ліўневай каналізацыі жыхары пасёлка Старобін Салігорскага раёна. Пад першым лістом падпісаліся 19 чалавек, а пад другім — 544. Толькі пасля даручэння кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі Качанавай мясцовыя ўлады праклалі сеткі водазабеспячэння, расчысцілі меліярацыйны канал.

Як адзначыў Рыгор Шлык, такія сітуацыі становяцца магчымымі ў выніку адсутнасці жорсткага кантролю, зацягвання тэрмінаў выканання, непрыняцця мер уздзеяння да службовых асоб, дзеяння прывычкі працаваць як удасца. Ён заклікаў усіх больш уважліва ставіцца да патрэб грамадзян: «Усе розныя, але гэта нашы людзі, і мы павінны кожнага пачуць і пастарацца дапамагчы».

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**